# Невядомы працэс: суд над ваеннымі злачынцамі ў Кобленцы (1962–1963) і асэнсаванне нацысцкіх злачынстваў на Ўсходзе і Захадзе

**06.07.2026**
**17:00-18:30 (Берлін)**
**18:00-19:30 (Мінск)**

Дыскусія адбудзецца на беларускай і нямецкай мовах з сінхронным перакладам.

Auswärtiges Amt

CIVIL SOCIETY COOPERATION

ФОРУМ БЕЛАРУСЬ
FORUM BELARUS

DGO
Deutsche Gesellschaft für Osteuropakunde e.V.

**Для ўдзелу ў дыскусіі прайдзіце, калі ласка, рэгістрацыю па спасылцы:**

**https://us02web.zoom.us/webinar/register/WN_Z92-mKS0S-KldOkvpmtsEQ**

У кастрычніку 2026 года спаўняецца 80 гадоў з моманту завяршэння Міжнароднага ваеннага трыбунала ў Нюрнбергу – самага вядомага працэсу над нацысцкімі злачынцамі. У 1946–1947 гадах у БССР адбыліся падобныя судовыя працэсы ў Мінску, Віцебску, Гомелі і Бабруйску.

У 1962–1963 гадах у Кобленцы прайшоў адкрыты суд над адзінаццаццю абвінавачанымі, якія ў 1941–1944 гадах здзяйснялі ваенныя злачынствы на тэрыторыі Беларусі. Аднак гэты працэс не атрымаў значнай увагі ні ў савецкай, ні ў постсавецкай беларускай гістарыяграфіі.

У межах анлайн-дыскусіі на прыкладзе працэсаў у Мінску (1946) і Кобленцы (1962–1963) прапануем прааналізаваць розныя формы юрыдычнай ацэнкі і грамадскага асэнсавання нацысцкіх злачынстваў ў СССР і ФРГ. У цэнтры ўвагі будуць наступныя пытанні: якія падабенствы і адрозненні можна выявіць у расследаванні, выстаўленні абвінавачанняў і асуджэнні ваенных злачынцаў? Як выглядала супраца савецкіх і заходненямецкіх органаў юстыцыі? Да якой мясцовай і міжнароднай публікі былі скіраваныя працэсы? Як яны ўспрымаліся грамадскасцю і асвятляліся ў медыя СССР, ФРГ і ГДР? Як яны адлюстраваліся ў пісьмовых і вусных сведчаннях? Якія этычныя і юрыдычныя пытанні паўсталі ў выніку гэтых працэсаў і прысудаў? І якое значэнне яны мелі для гістарычнага асэнсавання, культуры памяці і грамадскага ўяўлення пра віну і справядлівасць?

### Мадэрацыя
**Віктар Шадурскі,** незалежны гісторык, Уроцлаў

### Эксперткі ды эксперты
**Францыска Экселер,** Свабодны ўніверсітэт, Берлін
**Аляксандр Фрыдман,** Саарскі ўніверсітэт
**Ясмін Зёнэр,** Гайдэльбергскі ўніверсітэт

### Уводзіны
**Ірына Кашталян,** Мемарыял Бухенвальд